PolotskSU



**УДК 882.6(09)**

# МАСТАЦКІ ГІСТАРЫЗМ У ПРОЗЕ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА

***Г.В. НАВАСЕЛЬЦАВА***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)***

*На прыкладзе празаічнай спадчыны Вацлава Ластоўскага (у сінхронным кантэкстуальным параўнанні з творамі Максіма Гарэцкага) выяўляецца спецыфіка жанравага фарміравання гістарычнай прозы ў пачатку XX стагоддзя. Станаўленне гэтага жанру ў беларускай літаратуры, у адрозненне ад заходнееўрапейскага прыгожага пісьменства, адбывалася ў сярэдняй і малой прозе. Выкарыстаны ў аўтарскіх легендах і апавяданнях прыём увасаблення ў сціслым непасрэдна падзейным часе вялікага тэмпаральнага адрэзку дазваляў асэнсаваць розныя перыяды беларускай гісторыі, усвядоміць гістарычную спадчыну пэўных эпох, выпрацаваць мастацкім спосабам гістарычную перыядызацыю. Пры гэтым у «нацыянальна-гістарычных» творах Вацлава Ластоўскага адбываецца апрабацыя такіх мастацкіх вобразных сродкаў гістарычнай паэтыкі, як стылізаванае летапіснае пісьмо, «перакрыжаванне» часоў, увядзенне «скразных вобразаў», канкрэтна-гістарычнага датавання, якое становіцца асновай для аўтарскага выкладання падзей.*

**Уводзіны.** Як вядома, развіццё літаратурнага працэсу залежыць ад грамадскай думкі, яе актуальных запатрабаванняў. Спецыфіку мастацтва слова пачатку XX стагоддзя прадвызначыла станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў першыя дзесяцігоддзі, беларусізацыя 20-х гадоў. Тагачасная нацыянальная ідэя патрабавала асэнсавання гістарычнага мінулага, «сопряжения» старажытнай гісторыі з новымі эпахальнымі падзеямі, выпрацоўкі знакавай гістарычнай канцэпцыі, якая б раскрыла працэс самаўсведамлення нацыі. На грамадскім узроўні адбывалася «ўсталяванне» гісторыі, што ў сваю чаргу не магло не адбіцца і на ўзроўні мастацкага асэнсавання мінулага. На гэтым гісторыка-літаратурным этапе створаны адметныя прыклады пісьменніцкіх канцэпцый гісторыі, якія сведчаць пра мастацкае станаўленне гістарычнай прозы.

Агульнапрынята лічыць жанр дынамічнай сістэмай, што на розных этапах развіцця, у розных сваіх мадыфікацыях увасабляе як індывідуальныя пошукі творцы, так і сацыякультурныя тэндэнцыі адпаведнага часу. У пачатку XX стагоддзя спецыфічныя грамадскія фактары актуалізавалі працэс фарміравання гістарычнай прозы, які распачаўся яшчэ ў XIX стагоддзі і які завяршыцца жанрава сталай прозай Уладзіміра Караткевіча ў другой палове XX стагоддзя. А на літаратурным этапе пачатку XX стагоддзя не аформленасць жанру не стала перашкодай для з’яўлення высокамастацкіх твораў пра мінулае. Гэта можна патлумачыць словамі Генадзя Паспелава, які называе жанр «толькі адным, і прытым адасобленым, «тыпалагічным» аспектам зместу мастацкіх твораў. Форма твораў, уся сістэма прынцыпаў і прыёмаў іх пабудовы вызначаецца, зразумела, не адным такім аспектам, але ўсімі аспектамі іх зместу, і перш за ўсё гістарычна канкрэтнымі яго асаблівасцямі – тэматыкай, праблематыкай, ідэйна-эмацыйнымі адносінамі пісьменніка да жыцця – пафасам іх твораў» [1, с. 190]. Мастацкія творы пра мінулае гісторыка па адукацыі, «неадменнага сакратара Адраджэння» Вацлава Ластоўскага вызначаюцца гістарычнай тэматыкай і праблематыкай. Пісьменнік выпрацоўвае канцэпцыю беларускага мінулага, адной з асноўных сутнасных рыс якой з’яўляецца гістарыязацыя, што дазваляе маркіраваць падзеі ў міфалагічным кантэксце і ўключыць іх у часавую парадыгму. У гістарычнай паводле тэматыкі і праблематыкі прозе Вацлава Ластоўскага з’явіліся асноўныя тыпалагічныя жанравыя адметнасці, якія хоць не набылі таго функцыянальнага значэння, што ўласціва ім у сфарміраванай гістарычнай прозе, аднак прайшлі сваю першасную мастацкую апрабацыю.

**Асноўная частка.** Тэрмін гістарычны жанр ўжываецца як у вузкім значэнні – жанравай разнавіднасці, – так і ў больш шырокім – «віду, аб’ядноўваючы творы ўсіх родаў літаратуры, у якіх знайшло адлюстраванне далёкае мінулае» [2, с. 175]. Пры гэтым тэматыка і праблематыка выступае галоўным жанравызначальным крытэрыем і ў вузкім, і ў шырокім разуменні. Вузкае разуменне ілюструюць прыклады з заходнееўрапейскіх літаратур, дзе станаўленне і развіццё гістарычнай прозы адбываецца ў вялікіх празаічных жанрах, у прыватнасці, рамане. Так, сутнасным ядром раманнага жанру выступае дамінуючы тып праблематыкі: «Дамінуючыя, генералізуючыя, цэнралізуючыя праблемы або групы праблем, якія як бы адыгрываюць галоўную ролю, «прадпісваючы» выбар, размяшчэнне і суадносіны мастацкіх пластоў, што складаюць змест твора» [3, с. 8]. Шырокае разуменне раскрывае вычарпальная класіфікацыя Генадзя Паспелава, які вывучае праблему літаратурных жанраў [1]. Даследчыкам вылучаюцца міфалагічныя, «нацыянальна-гістарычныя», «нораваапісальныя», раманічныя жанры, якія на працягу літаратурнага працэсу саступаюць адзін аднаму вядучую пазіцыю. Раман «найбольш буйны і значны жанр сярод цэлай групы роднасных яму жанраў, якую ў выніку гэтага можна было б назваць раманічнай групай. Побач з уласна раманамі ў вершах і прозе існуюць раманічныя паэмы (у вузкім сэнсе слова) і раманічныя аповесці (у тым жа сэнсе)» [1, с. 205]. Галоўная прыкмета любога раманічнага твора – гэта асобаснае, індывідуальна-непаўторнае бачанне свету літаратурным героем. Пры гэтым звяртаецца асаблівая ўвага на непаўторнасць лёсу чалавека, магчымасці маральнага і разумовага яго развіцця, станаўленне характару ў знешніх абставінах, у сутыкнкненні з нормамі і ўяўленнямі старога свету. Таксама называе як жанраўтваральны асобасны крытэрый Вадзім Кожынаў, які звяртае ўвагу на «гістарычнае значэнне» фактаў

PolotskSU



асабістага жыцця героя [4]. Беручы за аснову гэты крытэрый, да ліку твораў гістарычнага жанру трэба аднесці і апавяданне – малы празаічны жанр. З малых празаічных жанраў Генадзь Паспелаў да ліку раманічных адносіць навелу – «старэйшую сястру» рамана, таму, думаецца, будзе аб’ектыўным лічыць прыналежнымі да гістарычнай прозы творы адпаведнай тэматыкі і праблемытыкі розных празаічных жанраў, персанажы якіх адрозніваюцца індывідуальна-непаўторным успрыманнем свету. Паколькі ў беларускім прыгожым пісьменстве з-за неспрыяльных знешніх абставін не склалася раманічная традыцыя развіцця гістарычнай прозы, то станаўленне апошняй трэба разглядаць на прыкладзе сярэдніх і малых празаічных жанраў – аповесцей і апавяданняў, гэта значыць у шырокім тэрміналагічным разуменні. Раманічнай з’яўляецца аповесць Вацлава Ластоўскага «Лабірынты», у якой нацыянальная ідэя ўвасоблена ў персаніфікаванай форме. Акрамя аповесці, раманічнымі з’яўляюцца і такія апавяданні пісьменніка, як «Старасельскі могільнік», «Прывід».

Асобна трэба спыніцца на «нацыянальна-гістарычных» творах (легендах, паданнях і да таго падобнага), якія таксама прадстаўлены ў творчай спадчыне Вацлава Ластоўскага. Пра «нацыянальна-гістарычныя» творы Генадзь Паспелаў зазначае: «Стваральнікі гэтых твораў цікавіліся ў асноўным гістарычным станаўленнем і лёсам цэлых народнасцей, і асобныя чалавечыя характары, адносіны паміж імі, падзеі, што ўзніклі ў выніку іх дзейнасці, разглядалі як увасабленне і праяўленне гэтага агульнанароднага, у шырокім сэнсе – нацыянальнага лёсу» [1, с. 170]. Падкрэсліваецца, што «нацыянальна-гістарычны» перыяд – фальклорны, што творы, створаныя невядомымі аўтарамі ў гэты час, хоць і працягвалі сваё бытаванне ў наступны перыяд, аднак не вызначаюць спецыфіку літаратурнага этапа, а створаныя ў пазнейшы час «нацыянальна-гістарычныя» творы – адзінкавыя. Гэтым абумоўліваецца той факт, што значная частка спадчыны Вацлава Ластоўскага з’яўляецца раманічнай. Разам з тым пісьменнік стварае і запатрабаваныя грамадскай думкай «нацыянальна-гістарычныя» мастацкія палотны, якія раскрываюць знакавыя для нацыянальнай ідэі матывы і вобразы.

Адным з паказальных вобразных сродкаў, якім маркіруюцца «нацыянальна-гістарычныя» творы Вацлава Ластоўскага, да ліку якіх адносяцца не толькі аўтарскія легенды і паданні, але і некаторыя апавяданні легендарнага зместу, з’яўляецца мастацкі час, што ў раманічных творах набывае персаніфікаванае ўвасабленне, а ў аўтарскіх легендах і паданнях інтэрпрэтуецца ў адпаведнасці з фальклорнай тэмпаральнасцю. Паколькі тэматыка і праблематыка раманічных і «нацыянальна-гістарычных» твораў пісьменніка блізкая, то мастацкі час з’яўляецца сэнсава рэпрэзентатыўным вобразным сродкам, які дазваляе вызначыць два стылёва адрозныя тыпы прозы ў спадчыне аўтара. Так, раманічны змест аповесці «Лабірынты» маркіруецца цыклічнай часавай парадыгмай: мінулае («залатая эпоха») кантрастуе з сумнай сучаснасцю і павінна ва ўсёй велічы і славе адрадзіцца ў будучым. «Вялікая ідэя», «сакральная каштоўнасць», першасны сімвал [5, с. 344] мінулага – гэта вялікая краіна волатаў-прашчураў Крывія. Цыклічны змест гістарычнай парадыгмы Вацлава Ластоўскага ўвасабляе адраджэнскую ідэю: міфалагічная «залатая эпоха» гістарызуецца, асэнсоўваецца адначасова ў двух тэмпаральных вымярэннях – мінулым і будучым. У тэмпаральнасці «нацыянальна-гістарычных» твораў адрозніваецца непасрэдна падзейны час (неперарыўны) і прамежкавы падзейны час (дыскрэтны) [6]. Але калі прамежкавы час пры дапамозе лічбаў (тры, сем, дзевяць) характарызуецца канкрэтна і дакладна, то непасрэдны час раскрываецца спецыфічна. Адлюстраванне непасрэдна падзейнага часу сціслае: адзін дзень ці іншы кароткі часавы прамежак роўны па значэнні цэлай эпосе. Гэта дазваляе ўключыць у гістарычную канцэпцыю вялікія часавыя адрэзкі, асэнсаваць асноўныя вынікі эпохі, ахапіць значныя гістарычныя далягляды, што спрыяла працэсу «ўсталявання» гісторыі.

Сказанае абумоўлівае мэту нашага даследавання – выявіць спецыфіку жанравага фарміравання гістарычнай прозы на акрэсленым гісторыка-літаратурным этапе (на прыкладзе празаічнай спадчыны Вацлава Ластоўскага). Мэта прадугледжвае вырашэнне наступнай задачы – прааналізаваць са спадчыны Вацлава Ластоўскага выбраныя творы малых празаічных жанраў у сінхронным кантэкстуальным параўнанні з творамі Максіма Гарэцкага, што паспрыяе больш глыбокаму даследаванню творчай манеры Вацлава Ластоўскага.

Тыповым прыкладам «нацыянальна-гістарычнага» твора, у якім блізка да фальклорнай традыцыі інтэрпрэтуецца катэгорыя тэмпаральнасці, з’яўляецца легенда «Векавечная мяжа». Змаганне князя Радара са змеем Крагавеем ў творы тэмпаральна кароткае: князь робіць саху, у якую запрагае змея, «і вось аралі яны лес, аралі луг, аралі поле і даараліся да вялікай ракі» [7, с. 161]. Вынікам гэтага дзеяння стала ўсталяванне дзяржаўнай мяжы: «З гэных часоў і на векі-вечныя тая разора, якую празвалі Бухам, ці Бугам, сталася граніцай паміж нашым і ляшскім краем» [7, с. 161]. Працэс, які ў беларускай гісторыі заняў не адно стагоддзе, у творы ўвасоблены сцісла. За такім тэмпаральным маркіраваннем хаваецца цэлая эпоха міжнацыянальных узаемаадносін беларусаў з іх заходнімі суседзямі: гістарычныя факты ўвасоблены ў цудадзейнаўмоўнай форме, якая дазваляе ўсвядоміць вынікі гістарычнага працэсу, хоць аўтарам і не прыводзяцца канкрэтна-гістарычныя звесткі. Героем твора выступае легендарная асоба, якую яшчэ цяжка назваць непаўторнай індывідуальнасцю. Князь-пераможца з’яўляецца фальклорным тыпам героя, які раскрываецца пісьменнікам сродкамі традыцыйнай вобразнасці. Разам з тым трэба адзначыць, што аўтарскі зварот да эпічных матываў і вобразаў, у прыватнасці да эпічнага героя, быў крокам наперад у параўнанні з традыцыяй Яна Баршчэўскага, які інтэрпрэтуе чарадзейную казку. Легендарны герой Вацлава Ластоўскага праяўляе ўласную ініцыятыву і самастойна, не спадзеючыся на нечую чарадзейную дапамогу, здзяйсняе задуманае, чым набліжаецца да індывідуальна-аўтарскага раманічнага персанажа. У творы Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня...» (апавяданне «Дзіўны кій») працавіты і пачцівы парабак Алёша змагаецца з Вялікім Чарна-

PolotskSU



кніжнікам і перамагае яго з дапамогай незвычайнага кія. Дастаткова падняць «да неба той канец кія, якім абапіраешся на зямлю, і адразу зробіцца ўсё, што ты захочаш» [8, с. 273].

У легендзе «Сож і Дняпро» апавядаецца пра ператварэнне бацькі і двух сыноў у рэкі: «Дняпро плыве садамі ды лугамі, Сож імхамі ды балотамі, а Рыдан – куды вочы глядзяць» [7, с. 143]. Аднак «нацыянальна-гістарычную» ідэю твора пра паходжанне беларускіх рэк раскрывае яго сімволіка-алегарычны ўзровень. Так, вялікі валадар, сівавалосы Рыдан мае цудадзейную залатую карону, якая можа рабіць ноч днём, а зіму – летам. «Завідавалі суседнія валадары і князі гэтай кароне і пастанавілі дабыць яе ў Рыдана. Сазвалі варажбітоў і знахароў і загадалі ім прыдумаць спосаб, каб украсці карону з Рыданавага скарбца» [7, с. 142]. Пасля страты залатой кароны жадае «слязьмі разліцца» стары Рыдан і разам з сынамі, што пусціліся даганяць выкрадальнікаў скарбу, ператвараецца ў рэкі: «А з таго часу ўсе сілы ляснога краю плывуць у чужыя моры і там прападаюць...» [7, с. 143]. Карона ўвасабляе дзяржаўную незалежнасць, і ў кароткім часавым прамежку яе страты рэпрэзентуецца тэмпаральна працяглы для беларусаў момант – страта дзяржаўнай самастойнасці.

Гэтыя два творы ілюструюць прыклады блізкай да фальклорнай традыцыі аўтарскай інтэрпрэтацыі «нацыянальна-гістарычнага» зместу. Разам з тым Вацлаў Ластоўскі звяртаецца да адметнай фальклорнай стылізацыі, увасабляючы ў легендарнай форме шэраг знакавых для беларускай гісторыі персанажаў. Так, асобную групу апавяданняў легендарнага тыпу, паводле азначэння Вольгі Барысенкі, складаюць «Беларускі радавод», «Князёўна Рагнеда», «Ізяслаў», «Усяслаў», «Бітва каля Магільны», «Вітаўт і Ягайла», што аб'яднаны ў своеасаблівы храналагічны ланцужок. З гэтага пераліку выбіваюцца «Беларускі радавод» (аўтар гістарыязуе міфалагічны беларускі імёнаслоў) і «Бітва каля Магільны» (інтэрпрэтуецца гістарычны факт). Аднак астатнія чатыры творы расказваюць пра гістарычных персанажаў: аўтар імкнецца распавесці свайму сучасніку пра пакуль што малавядомага героя, асэнсаваць значэнне гэтай гістарычнай асобы, вызначыць яе месца ў мінулым. Такім чынам, праз асобаснае раскрыццё, вяртанне і адраджэнне, адбывалася «ўсталяванне» гісторыі, якую трэба было ахапіць у знакавых матывах і вобразах. Аўтар праз сцісла-персаніфікаваны час свайго героя сузірае яго эпоху, увасабляе ў кароткім адрэзку непасрэдна падзейнага часу вялікае тэмпаральнае вымярэнне. У прыватнасці, прасочваючы жыццёвы шлях Рагнеды, Вацлаў Ластоўскі раскрывае лёс княства пасля спалення Полацка і забойства Уладзімірам Рагвалода. Працэс адраджэння Полацкага княства звязваецца з дзейнацю сына Рагнеды Ізяслава. Росквіт Полацкай зямлі аўтар атаясамлівае з жыццём князя Усяслава, празванага Чарадзеем: «Людзі забабонныя расказвалі, што князь Усяслаў перакідваецца ў ваўка і ноччу абягае сваё і суседнія княствы і бачыць усё, дзе што і як робіцца, што вочы яго праз найтаўсцейшыя сцены бачаць і вушамі ён за соткі міль кожны голас чуе» [7, с. 151]. Лёс беларускай зямлі ў XIV стагоддзі звязваецца пісьменнікам з асобамі Вітаўта і Ягайлы. У адрозненне ад герояў твораў «Векавечная мяжа», «Сож і Дняпро», факты асабістага жыцця Рагнеды, Ізяслава, Усяслава, Вітаўта і Ягайлы набываюць «гістарычнае значэнне». Хоць выбраная Вацлавам Ластоўскім форма легенды не дазваляе маштабна разгарнуць твор і надаць героям больш індывідуальна-канкрэтныя рысы. Пры гэтым гістарычны кантэкст твораў маркіруецца адзінкава названымі канкрэтнымі датамі, якія і становяцца дакументальнай асновай для прадстаўлення вялікай тэмпаральнасці: «Тысячу з лішнім гадоў таму жыў у Полацку, на той час сталічным месце ўсёй Беларусі, князь Рагвалод» [7, с. 149] («Князёўна Рагнеда»); «У 988 гаду Уладзімір і ўсе кіеўцы – і баяры, і просты народ – прынялі хрысціянства» [7, с. 151] («Ізяслаў»); «Княжыў Усяслаў 87 гадоў, памёр у 1101 гаду» [7, с. 151] («Усяслаў»); «А былі ў канцы XIV сталецця ў нашай зямлі два маладыя князі: аднаго звалі Ягайла, і ён княжыў у Віцебску, а другога звалі Вітаўт, і княжыў ён у Троках» [7, с. 153] («Вітаўт і Ягайла»).

Прыём канкрэтна-гістарычнага датавання з'яўляецца адным з выяўленчых сродкаў гістарычнай паэтыкі. Храналагічная паслядоўнасць і выбранае апісанне падзей і іх удзельнікаў з'яўляюцца характэрнымі прыкметамі летапісу. Думаецца, мае месца быць аўтарская стылізацыя летапіснага пісьма: Вацлаў Ластоўскі спыняецца на адметных, з яго пункта погляду, гістарычных асобах, разглядае паходжанне героя, называе яго асноўныя ўчынкі і дае ім сваю выразную ацэнку. Самі творы пра Рагнеду, Ізяслава, Усяслава, Вітаўта і Ягайлу ўяўляюць летапісныя апавяданні, кожнае з якіх прысвечана раскрыццю пэўнага героя або герояў. «Нацыянальна-гістарычны» змест аўтарскай кампіляцыі надае асэнсаванне вобразаў, напрыклад, Ізяслава і Усяслава як мудрых уладароў усёй беларускай зямлі: «Уладзімір адпусціў яе ў Бацькаўшчыну і Ізяславу аддаў усю беларускую зямлю. Ізяслаў доўга і шчасліва княжыў у Беларусі і пабудаваў горад Ізяслаў, недалёка ад Мінска (цяпер маленькае мястэчка і завуць яго Заслаўе)» [7, с. 151] («Ізяслаў»); «Калі князь Усяслаў вырас і стаў княжыць над беларускай зямлёй, то ён мудрымі войнамі расшырыў межы беларускага княства. Суседнія князі яго шанавалі за мудрыя рады, народ любіў за справядлівасць, а ворагі баяліся яго» [7, с. 151] («Усяслаў»). Калі ў сталай гістарычнай прозе прыём летапіснага выкладання выкарыстоўваецца дзеля сцвярджэння праўдзівасці мінулага, для аргументацыі маральна-этычных учынкаў героя, то Вацлаў Ластоўскі выкарыстоўвае летапісны стыль з мэтай гістарыязацыі легендарных падзей і іх славутых удзельнікаў. Пісьменнік імкнецца сцвердзіць праўдзівасць самой беларускай гісторыі, якая на сучасным яму літаратурным этапе толькі пачынала асэнсоўвацца грамадскай думкай. Неабходна было выпрацаваць перыядызацыю беларускай гісторыі, якая ў другой палове XX стагоддзя стане асновай для канкрэтна-гістарычнага ўвасаблення мінулага. Адсутнасць распрацаванай гістарычнай перыядызацыі аказала пэўны ўплыў на фарміраванне канцэпцыі беларускага мінулага ў Вацлава Ластоўскага, якая вызначаецца цыклічнасцю і адмаўляе лінеарную трактоўку падзей.

PolotskSU



Акрамя фальклорнай інтэрпрэтацыі і летапіснай стылізацыі аўтар звяртаецца да мастацкай распрацоўкі некаторых гістарычных фактаў (легенда «Разбойнік», апавяданне «Троцкі замак»). Пра легенду «Разбойнік» Алесь Макарэвіч зазначае, што «гістарычны факт спалучаецца з цудадзейнай фактуальнасцю з дамінаваннем апошняй» [9, с. 47]. Думаецца, у гэтым творы прадстаўлены асноўныя, уласцівыя творчай манеры пісьменніка, рысы. Так, Вацлаў Ластоўскі інтэрпрэтуе фальклорную думку: у твор уключаны аповед пра асілка-Разбойніка, які з кожнай ладдзі патрабаваў выкуп. Аднойчы ён наважыўся патрабаваць выкуп з ладдзі князёўны Ефрасінні, якая выправілася ў падарожжа ў святую зямлю. Сілай святога слова князёўны Разбойнік быў ператвораны ў камень і такім чынам атрымаў заслужанае пакаранне за ўсе свае дрэнныя ўчынкі. Гэты «сказ народны», як называе яго ў апавяданні сам аўтар, актуалізуе пазнанне мінулага, абуджае цікавасць да гісторыі: «Дзіўны ты, сказе народны, вольны ты птаху! Ты ўміг пралятаеш ад сучаснасці да мінулых вякоў... Ты мёртвыя камяні ажыўляеш і кладзеш ім у вусны думы свае, павяраеш ім скрытыя надзеі і жаданні...

Не для цябе, сказе народны, тораны шляхі, дзелены межы! Не знаеш ты вострага зубу ўсёпажыраючага часу, ані згладжываючага цалунку смерці. Ты мёртвае ажыўляеш, забытае ўваскрасаеш, і волен тварыці дзівы. А калі дзе смерцю ўсне дух народны, там ты камяні ажыўляеш, і адараеш іх прарочым голасам, і кажаш ім ісці будзіці пабітых на духу, мерцвякоў хадзячых...» [7, с. 146].

Вацлаў Ластоўскі дапаўняе «сказ народны» аўтарскай персаніфікацыяй вобраза каменя-Разбойніка, што ўвасабляе сціслы непасрэдна падзейны час, за якім прадстаўлены розныя эпохі беларускай гісторыі. Так, камень-Разбойнік, які бачыў яшчэ ладдзі «Полтэса, вікінга-князя», стаў сведкам перыяду, «калі немцу ў Русі, а русічу на кгоцкім беразе была адна праўда». Гэта час росквіту Полацкага княства, мірнага гандлю з далёкімі землямі. Аднак на змену гэтаму перыяду прыходзіць іншы, калі «не было русічу праўды на кгоцкім беразе...», і камень-Разбойнік становіцца сведкам барацьбы з крыжакамі. Такім супастаўленнем дзвюх эпох аўтар не толькі распрацоўвае свой варыянт перыядызацыі беларускай гісторыі, але і выкарыстоўвае прыём, што будзе пасля актыўна ўжывацца ў сталай у жанравых адносінах прозе: «перакрыжаванне» або накладанне розначасовых гістарычных пластоў. Пры гэтым камень-Разбойнік, які праходзіць праз усе гістарычныя перыяды, становіцца «скразным вобразам»: праз сваю нязменную прыналежнасць да мінулага ён набывае пазачасавы змест і заканамерна пераходзіць у сучаснае і будучае.

Адлюстроўваецца пазачасавасць мінулага і ў апавяданні «Троцкі замак». У твор уводзіцца легендарны матыў: утоплены ў возеры князь пасля сваёй смерці сабраў дружыну ў падводных скляпеннях, павесіў звон і штогод на Вербніцу, у гадавіну сваёй смерці, ударае ў звон. «Ведныя людзі чуюць гэты звон. Трыкротны ўдар у звон, і ігра ў вайсковую трубу апавесцяць яго выхад на свет. Гэты выхад паложыць канец самаволі, голаду і холаду ў хацінках з лапінкай няўжытку, з якога гаротнаму селяніну трэба ўтрымаць, накарміць, абуць і адзець увесь чужацкі дзяржаўны будынак, дом няволі» [7, с. 125]. У аснову легенды пакладзены канкрэтны гістарычны факт: Жыгімонт Кейстутавіч быў забіты шляхтай у Троцкім замку ў Вербную нядзелю 1440 года. Пра жыццё сялянскага князя выказваюцца два летапісцы: адзін параўноўвае князя з Ірадам, бо ён хацеў вынішчыць род шляхецкі, а падняць род хлопскі, а другі бачыць князя патрыётам: «Бо ён ляхоў, як сабак, не любіў, Літву ж і Русь нашу любіцельна мілаваў...» [7, с. 124]. У гэтым творы Вацлава Ластоўскага, як і ў жанрава сфарміраванай гістарычнай прозе, рэаліі таго часу раскрываюцца шляхам супастаўлення летапісных крыніц. Пісьменнік праз персаніфікаваны вобраз Жыгімонта Першага асэнсоўвае яго эпоху. На сімвалічным узроўні мінулае ўвасабляецца вобразам незвычайнага, таямнічага Троцкага замка. Гэта інтрыга задаецца аўтарам на ідэйна-мастацкім узроўні: «Востраў дрэмле, панураны ў сваю мінуўшчыну, ды пасміхаецца ў неба пакрышанымі старчымі зубамі старых развалін. Нешта таёмнае прытаілася, прымоўкла, можа, ізноў страпянецца, захвалюецца, загучыць, затопае, загалёкае, ажыве... Па крушнях, з пасмешкі пакрышаных зубоў, стырчачых у неба, відаць, што касцістая рука смерці не замарозіла, а толькі прымарыла тут мінуўшчыну» [7, с. 122].

Тыпалагічна блізкім аўтарскаму «нечаму таёмнаму» з’яўляецца асэнсаванне мінулага Максімам Гарэцкім, які прадстаўляе яго неад’емна ад «патаёмнага», уводзіць у свае творы міфалагему «цёмнага лесу». У прыватнасці, у апавяданні «Лірныя спевы» аўтар інтэрпрэтуе гісторыю радзімічаў (Вацлаў Ластоўскі як беларускую ўвасабляе гісторыю крывічоў) на прыкладзе Саламярэцкага княства. Аўтар замяняе канкрэтна-гістарычныя факты мастацкай умоўнасцю, звязваючы перыяд росквіту княства з вобразамі князя Лугквеня і яго сына Мсціслава, а перыяд заняпаду – з князёўнай Ганнай. Максім Гарэцкі імкнецца «зацямніць» гісторыю княства, пра што сведчыць вобраз Янкі-лірніка, носьбіта аўтарскай ідэі, і чатыры часавыя ўзроўні твора. «Першы – рэальна-канкрэтны; ён папярэднічае далейшаму, так званаму сучаснаму дзеянню. Другі – даўні легендарны, які стане завязкай, першаштуршком для падзей інтрыгі верхняга плана. Трэці, звязаны з першым, – працяг яго і адначасова вынік другога праз прыём ажыўлення, уваскрасення гераіні легенды» [10, с. 18]. Заключны чацвёрты ўзровень, працягвае Вольга Шынкарэнка, падае рэальныя падзеі пасля пэўнага часавага прамежку. На чацвёртым узроўні ў вобразе адданага ўспамінам Янкі-лірніка, які спявае «і аб часах Літоўскай Русі, і аб уладарстве князёў саламярэцкіх над радзімічамі» [11, с. 112 – 113], спалучаюцца ўсе папярэднія часавыя пласты. Думаецца, Янка Прокляты, вясковы лірнік, адлюстраваны згодна з фальклорнай традыцыяй, выступае «скразным вобразам», які прыналежны мінуламу (трэці часавы ўзровень, які раскрывае рэчаіснасць Саламярэцкага княства), сучаснаму (лірнік – натхнёны носьбіт праўды мінулага, які расказвае яе сучасным пакаленням) і праз пазачасавы змест мінулага далучаецца да будучага. Таямнічым з’яўляецца спазнанне Янкам-лірнікам гісторыі Саламярэцкага княства. Герой падарожнічае праз «цёмны лес»

PolotskSU



у купальскую ноч: «Нярана ўжо, час а поўначы, а дарожка нявідная ўсё цягнецца без канца па цёмным лясу. Калі йшчэ тое поле Залясянскае, а страшна тут аднаму» [11, с. 108], цудадзейным чынам бачыць княжну і атрымлівае праклятце. Нераспрацаванасць гістарычнай канкрэтыкі абумовіла тое, што Максім Гарэцкі ўвасабляе гісторыю ў арэоле «патаёмнага». Гэта павінна было абудзіць цікавасць сучаснікаў пісьменніка да вывучэння і асэнсавання беларускага мінулага.

Прадстаўляе мінулае ў канкрэтна-гістарычнай форме Максім Гарэцкі ў апавяданнях «Бітва на Уле», «Уцёкі Сярэбранага», у якіх адлюстроўваюцца факты ваеннай гісторыі – перамога беларускіх войскаў у бітве на Уле. У прыватнасці, у цэнтры ўвагі пісьменніка падзеі 1564 года, калі «вайна з Маскоўшчынай усхапілася з новаю сілаю» [12, с. 217]. Аўтар гістарычна дакладна распавядае пра войскі абодвух бакоў, пералічвае асноўных военачальнікаў, раскрывае тактыку вядзення вайсковых дзеянняў: «Радзівіл і Ходкевіч пільна сачылі за паходам арміі Шуйскага і ад свае старожы мелі пеўную і частую ведамасць. І калі Сярэбраны стаяў абозам за дзьве мілі ад Воршы, на рацэ Крапіўне, а Шуйскі быў пад Чашнікамі, у сяле Іванскім, вялікі гэтман з Грыгорам Ходкевічам, стольнікам Іванам Ходкевічам, з князямі: Богданам Саламерацкім, Раманам Сангушкаю, Багушом Карэцкім і іншымі надумаўся і шыбка зрыхтаваўся» [12, с. 218]. Названыя творы напісаны ў неўласцівым творчай манеры пісьменніка ключы і вызначаюцца дакладнай інтэрпрэтацыяй фактаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, раманічная і «нацыянальна-гістарычная» проза Вацлава Ластоўскага вызначаецца актуальнай для айчыннага грамадскага і літаратурнага кантэкстаў гістарычнай тэматыкай і праблематыкай. Але калі раманічныя творы раскрываюць індывідуальна-аўтарскую цыклічную канцэпцыю гісторыі: «залатую эпоху» мінулага краіну волатаў Крывію, то «нацыянальна-гістарычныя» творы адрозніваюцца рэальнай падзейнай канкрэтыкай, якая вылучаецца з міфалагічнага кантэксту. У «нацыянальна-гістарычных» творах пісьменніка, у адрозненне ад раманічных, не прадстаўлены індывідуальна-адметны герой, аднак факты асабістага жыцця эпічнага персанажа набываюць «гістарычнае значэнне» ў аўтарскіх легендах («Князёўна Рагнеда», «Ізяслаў», «Усяслаў», «Вітаўт і Ягайла»), апавяданні «Троцкі замак»: персаніфікаванае тэмпаральнае вымярэнне героя сімвалічна ўвасабляе яго эпоху. Аўтар шляхам рэпрэзентацыі легендарных матываў і вобразаў асэнсоўвае розныя перыяды беларускай гісторыі, усведамляе гістарычную спадчыну многіх эпох, выпрацоўвае перыядызацыю мінулага. Падобнае «ўсталяванне» гісторыі адбываецца дзякуючы плённаму прыёму, што дазваляе змяшчаць у сціслым непасрэдна падзейным часе малых празаічных жанраў вялікія тэмпаральныя вымярэнні (легенды «Векавечная мяжа», «Сож і Дняпро»), якія характэрны раману. Спецыфіка беларускага літаратурнага працэсу заключалася ў тым, што тэма гістарычнага мінулага ўвасаблялася ў ім спачатку ў сярэдняй і малой прозе, у якой таксама адбывалася апрабацыя вобразных сродкаў гістарычнай паэтыкі: летапіснае пісьмо («Троцкі замак» Вацлава Ластоўскага), «перакрыжаванне» часоў, увядзенне «скразных вобразаў» («Разбойнік» Вацлава Ластоўскага, «Лірныя спевы» Максіма Гарэцкага), канкрэтна-гістарычнага датавання («Троцкі замак» Вацлава Ластоўскага, «Бітва на Уле», «Уцёкі Сярэбранага» Максіма Гарэцкага). Адметнасць літаратурнага этапа станаўлення гістарычнай прозы пачатку XX стагоддзя, пра што сведчаць творы Вацлава Ластоўскага і Максіма Гарэцкага, выявілася ў аўтарскім імкненні заінтрыгаваць сваіх суайчыннікаў малавядомымі гістарычнымі матывамі і вобразамі, абудзіць іх цікавасць да асэнсавання нацыянальнага мінулага, паўплываць на грамадскае ўсведамленне важнасці духоўнай спадчыны.

ЛІТАРАТУРА

1. Поспелов, Г. Проблемы исторического развития литературы / Г. Поспелов. – М.: Просвещение, 1971. – 271 с.
2. Грамадчанка, Т. Сучасны беларускі раман: дынаміка жанру / Т. Грамадчанка. – Мінск: БДПУ, 2006. – 234 с.
3. Эсалнек, А. Типология романа (теоретический и историко-литературный аспекты) / А. Эсалнек. – М.: Изд-во МГУ, 1991. – 159 с.
4. Кожинов, В. Происхождение романа / В. Кожинов. – М.: Сов. писатель, 1963. – 439 с.
5. Философия истории: учеб. пособие / под ред. А.С. Панарина. – М.: Гардарики, 1999. – 432 с.
6. Медриш, Д. Структура художественного времени в фольклоре и литературе / Д. Медриш // Ритм, пространство и время в литературе и искусстве. – Л.: Наука, 1974. – С. 121 – 142.
7. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі; уклад., прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча. – Мінск: Бел. кнігазбор, 1997. – 512 с.
8. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі; уклад., прадмова і каментарыі М. Хаўстовіча. – Мінск: Бел. кнігазбор, 1998. – 480 с.
9. Макарэвіч, А. Праблемы жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А. Макарэвіч. – Магілёў: Выд-ва МДУ імя А.А. Куляшова, 1999. – 332 с.
10. Шынкарэнка, В. Нястомных пошукаў дарога: прабл. сучас. бел. гіст. прозы / В. Шынкарэнка. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 208 с.
11. Гарэцкі, М. Творы / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 629 с.
12. Гарэцкі, М. Бітва на Уле, Уцёкі Сярэбранага / М. Гарэцкі // Шляхам гадоў: гіст.-літ. зб. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 217 – 222.

*Паступіў 27.11.2007*